ность в выборе способов достижения образовательного результата, осуществление рефлексии на всех этапах учебной деятельности, создание ситуации успеха для поддерживания высокого уровня мотивации.


### Список использованных источников

1. Вейдт, В. П. Формирование профессионального тезауруса педагога: от теории к практике : монография / В. П. Вейдт ; под науч. ред. Т. Б. Гребенюк. – Калининград : Изд-во Калининградского областного института развития образования, 2016. – 180 с.
2. Лантюхова, Н. Н. Термин: определение понятия и его сущностные признаки / Н. Н. Лантюхова, О. В. Загоровская, Т. А. Литвинова // Вестник Воронежского института ГПС МЧС России. – 2013. – № 1. – С. 42–45.
3. Кошкина, Е. А. Развитие терминологии отечественной дидактики (начало XVIII – начало XX вв.): дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01 / Е. А. Кошкина. – СПб., 2016. – 474 л.
4. Кашлев, С. С. Интерактивные методы обучения. Учебно-методическое пособие / С. С. Кашлев. – Минск : ТетраСистемс, 2013. – 224 с.


УДК [37. 016 : 811. 161. 3] – 056. 263

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЗЕЦЬМІ З ПАРУШЭННЕМ СЛЫХУ

**А. Г. Міхалевіч**

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск, Беларусь, e-mail: 23091963e@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца метадычныя прыёмы, сродкі і спосабы вывучэння беларускай мовы дзецьмі з парушэннем слыху. Тут жа даюцца метадычныя рэкамендацыі да навучання згаданай катэгорыі школьнікаў беларускамоўнай літарна-гукавой сістэме, граматычнаму ладу, лексікалогіі праз параўнанне з рускамоўнымі з’явамі.

*Ключавыя словы:* граматычны лад, дзеці з парушэннем слыху, лексічны запас, літарна-гукавая сістэма, метадычны прыём.

У вучэбны план другога аддзялення спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы (спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната) для дзяцей з парушэннем слыху на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ 127 ад 09.06.2021 г.) уведзена сярод іншых (рускай і жэставай) трэцяя лінгвістычная дысцыпліна – беларуская мова. Яе вывучэнне адыгрывае істотную ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, выхаванні лепшых грамадзянскіх якасцей дзяцей. Для рэалізацыі асноўнай мэты – засваенне школьнікамі беларускамоўных лінгвістычных асаблівасцей – дзецьмі з парушэннем слыху вывучаюцца наступныя аспекты: а) літарна-гукавая сістэма, што прадугледжвае авалоданне асновамі

фанетыкі, арфаэпіі, акцэнталогіі, арфаграфіі роднай мовы; б) граматычныя лад (засваенне спецыфічных граматычных форм назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў і дзеясловаў, службовых часцін мовы ў параўнанні з рускамоўнымі); в) беларускамоўны слоўнік (папаўненне лексічнага запасу); г) кампаненты звязнага маўлення, а таксама напісанне дзелавых папер.

Пры навучанні беларускай мове неабходна зыходзіць з патрэб і інтарэсаў вучняў. Так, ілюстрацыйны матэрыял павінен быць ў першую чаргу зразумелым і цікавым і выступаць сродкам фарміравання маўленчай дзейнасці і сацыялізацыі згаданай катэгорыі школьнікаў. Акрамя таго, навучанне роднай мове належыць арганізоўваць з улікам асаблівасцей псіхафізічнага развіцця і магчымасцей вучняў, паколькі для дзяцей з парушэннем слыху школьнае навучанне пачынаецца ва ўмовах маўленчага недаразвіцця і звязаных з ім асаблівасцей пазнавальнай дзейнасці, што адлюстроўваецца на іх паводзінах, ступені актыўнасці, схільнасці да пэўных відаў дзейнасці і г. д. (пра гэта гл., напрыклад: [1, с. 90–97]). Для паспяховага вывучэння беларускай мовы дзецьмі з парушэннем слыху неабходна таксама стварыць прыймальныя ўмовы для ўспрыняцця маўлення. Менавіта таму тут павінны мець месца праца па развіцці навыкаў чытання з губ і спецыяльныя практыкаванні па тэхніцы маўлення. Варта адзначыць і спецыфічную ролю наглядных сродкаў, якія павінны пабуджаць дзяцей з парушэннем слыху да маўленчых зносін.

Навучанне беларускай мове дзяцей з парушэннем слыху варта пачынаць з фанетыкі, арфаэпіі і арфаграфіі, паколькі веданне гэтага матэрыялу будзе садзейнічаць далейшаму паспяховаму засваенню лінгвістычных правіл. Пры гэтым настаўніку варта звярнуць увагу на правілы вымаўлення беларускамоўных гукаў, якіх няма ў рускай мове: [ў], якому ў рускай мове адпавядаюць гукі [***в***] або [***л***], што перадаецца і на пісьме (параўн.: рус. правда, волк – бел. праўда, воўк); афрыкат [***дз’***], [***дж***]; працяжнага шчыліннага [***г***], у рускай жа мове ён выбухны (змычны); зацвярдзелых [***р***], [***ж***], [***ш***], [***дж***], [***ч***], [***ц***]; цвёрдых [***б***], [***п***], [***в***], [***ф***], [***м***] на канцы слоў; падоўжаных [***з’***], [***с’***], [***дз’***], [***ц’***], [***л’***], [***н’***], [***ж***], [***ш***], [***ч***], якія перадаюцца на пісьме падвоеным напісаннем літар; прыстаўных (пратэтычных) зычных [***в***], [***г***] і галосных [***і***], [***а***]; спалучэння [***шч***] і інш. Вывучэнне дадзенага матэрыялу ўключае і такія тэмы, як «Галосныя і зычныя гукі і літары», «Націскныя і ненаціскныя галосныя», «Звонкія і глухія зычныя»«Мяккасць зычных і яе абазначэнне на пісьме», «Склад», «Націск»і інш. Каб дзеці з парушаным слыхам змаглі засвоіць матэрыял і карыстацца ім ў практычнай дзейнасці, ім варта прапанаваць выкананне практыкаванняў тыпу: а) правільна (з улікам арфаэпічных нормаў) прачытаць словы (словазлучэнні, сказы, тэкст), назваць у іх спецыфічныя для беларускай мовы гукі; б) з ліку прапанаваных па-беларуску і па-руску запісаных слоў знайсці беларускамоўныя, адзначыць у іх «асаблівыя» гукі; в) у пераліку прапанаваных для аналізу слоў (словазлучэнняў, сказаў, тэксту) знайсці словы з пэўным гукам. Пры выпрацоўцы ўменняў у вучняў правільна вымаўляць словы настаўніку варта звярнуць увагу і на захаванне акцэнталагічных норм. Асабліва гэта датычыцца тых славянскіх і запазычаных лексем (часцей на-

зоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў і прыслоўяў), якія адрозніваюцца ў рускай і беларускай мовах месцам націску. Напрыклад: *ар**е**ст* (бел. ***а**рышт*), *в**е**рба* (бел. *вярб**а***), *в**о**лосы* (бел. *валас**ы***), *горяч**о*** (бел. *г**о**рача*), *доход**и**ть* (бел. *дах**о**дзіць*), *д**е**вятеро* (бел. *дзяв**я**цера*), ***и**мя* (бел. *ім**я***), *кро**и**ть* (бел. *кр**о**іць*), *м**а**лый* (бел. *мал**ы***), *н**а**спех* (бел. *насп**е**х*), *н**е**который* (бел. *некат**о**ры*), *нест**и*** (бел. *н**е**сці*) і інш. Прычым гэта могуць словы як з аднолькавым, так і розным лексічным значэннем. Напрыклад: бел. *к**а**ра* (рус. *наказание, возмездие*) – *кар**а*** (рус. *кора*); *кар**а**лі* (рус. *бусы, монисто, ожерелье*) – *карал**і*** (рус. *короли*); *л**ю**бы* (рус. *милый, любимый*) – *люб**ы*** (рус. *любой*).

Параўнальны падыход выкарыстоўваецца таксама пры вывучэнні вучнямі з парушэннем слыху і беларускага правапісу. Паколькі на папярэдніх уроках ужо праводзіўся гука-літарны аналіз слоў, пастаянна звярталася ўвага на называнне галосных і зычных гукаў і абазначэнне іх на пісьме, вучні ўжо павінны ўмець пісаць беларускамоўныя літары ***І і, Дж дж, Дз дз, ў*** і надрадковы знак **апостраф** ('). Таму вывучэнне арфаграфіі на дадзеным этапе зводзіцца да засваення асноўных правіл правапісу галосных ***о, э, у, а, ы*** пасля зацвярдзелых, а таксама пасля літар д, т; ***о, э – а; е, ё – я; у – ў*** (у нескладовага); ***д – дз, т – ц***; ***падоўжаных зычных; мяккага знака*** (змякчальнага і раздзяляльнага) ***і апострафа; звонкіх зычных на канцы слоў і ў сярэдзіне слоў перад глухімі зычнымі***. Практычнае засваенне вучнямі дадзеных правіл павінна абапірацца на веданне фанетыкі: каб дзеці з парушаным слыхам змаглі правільна напісаць слова, яны павінны перш за ўсё яго правільна вымавіць (магчыма, з дапамогай настаўніка), затым параўнаць вымаўленне і напісанне з рускамоўным варыянтам і запомніць. Таму асабліва частымі тут з'яўляюцца практыкаванні і заданні на тлумачэнне правапісу пэўнай літары ў правільна напісаным слове (як варыянт – знойдзенай памылкі ў няправільным варыянце) ці ўстаўленай самастойна вучнямі літары як арфаграмы.

Засваенне дзецьмі з парушэннем слыху лексікі беларускай мовы вядзецца таксама нярэдка пра параўнанне з рускамоўнымі эквівалентамі. Тут разглядаюцца словы розных тэматычных груп, якія выкарыстоўваюцца як у паўсядзённым жыцці вучняў (напрыклад: Сям'я. Кватэра. Школа. Чалавек. Здароўе. Прадукты харчавання. Жывёлы і інш.), так і накіраваныя на ўзбагачэнне іх грамадскага, сацыяльнага вопыту (Дзяржава. Прамысловасць. Культура. Мастацтва і інш.). Вялікая ўвага тут павінна надавацца фармальна, але не семантычна тоесным у беларускай і рускай мовах словам тыпу краска (у беларускай мове гэта кветка, рускамоўная ж лексема мае беларускамоўны *аналаг – фарба*), *нядзеля – неделя* і г. д. Варта звярнуць увагу тут і на значэнне слоў, абсалютна розных па графічнай форме ў беларускай і рускай мовах (напрыклад: *вавёрка – белка*, назвы месяцаў, дзён тыдня, ягад і г. д.), таксама сінонімаў (*смелы – адважны*), антонімаў (*добры – дрэнны*), амонімаў (*ручка – прылада для пісьма*, ручка – памяншальна-ласкальная форма слова рука), паронімаў (*адрасат – адрасант*).

Больш паспяховаму засваенню беларускамоўнай лексікі будзе садзейнічаць вядзенне школьнікамі руска-беларускага і беларуска-рускага слоўнікаў.

Пэўныя цяжкасці выклікае ў дзяцей з парушэннем слыху вывучэнне марфалогіі беларускай мовы, і асабліва самастойных часцін мовы. Шляхам параўнання з рускамоўнымі варыянтамі вучні павінны засвоіць канчаткі назоўнікаў I скланення ў давальным і месным склонах адзіночнага ліку, выбар якіх, як вядома, залежыць ад тыпу асновы, і асабліва з асновай на заднеязычныя г, к, х (напрыклад: **бел.** *кніга – кнізе*, *рука – руцэ*, *рэспубліка – рэспубліцы*, *муха – мусе*; **рус.** *книге, руке, республике, мухе*); II скланення ў родным і месным склонах (**бел.** *вецер – ветру, на ветры;* **рус.** *ветра, на ветру*); прыметнікаў і дзеясловаў (**бел.** *добры (-ае, -ыя)* – **рус.** *добрый (-ое, -ые)*; **бел.** *чытае, чытаюць, сядзіць, сідзяць* – **рус.** *читает, читают, сидит,сидят*); правільныя граматычныя формы лічэбнікаў і займеннікаў; нязменных і зменных форм дзеясловаў; службовых часцін мовы; адметнасці простага і складанага сказаў.

Пры развіцці ў дзяцей з парушаным слыхам навыкаў звязнага маўлення настаўніку належыць звярнуць увагу на выпрацоўку ўменняў слухаць і разумець сэнс тэкстаў розных жанраў беларускай літаратуры (апавяданняў, вершаў, паданняў, скорагаворак, загадак, пацешак, казак і інш.), адказваць на пастаўленыя пытанні і самім іх фармуляваць, рабіць пераказ больш аб’ёмных тэкстаў, выказваць сваю думку, меркаванне, ствараць уласнае выказванне і г. д.

Вывучэнне школьнікамі згаданых аспектаў беларускай мовы вядзецца з шырокім выкарыстаннем тэхналогій камунікатыўнай візуалізацыі, развіцця маўленча-мысліцельнай дзейнасці, калектыўнага спосабу навучання, узбуйнення дыдактычных адзінак і іншых разнастайных метадычных прыёмаў.

Такім чынам, у станаўленні дзіцяці з парушэннем слыху як грамадзяніна нашай краіны вялікую ролю адыгрывае вывучэнне сярод іншых прадметаў беларускай мовы, і асабліва яе фанетыкі, арфаэпіі, акцэнтуацыі, арфаграфіі, лексікалогіі і граматыкі.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Сурдопедагогика : учебник для студ. высш. пед. учеб. заведений / И. Г. Багрова [и др.]; под ред. Е. Г. Речицкой. – М. : Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2004. – 655 с.

УДК 378.147

## РЭАЛІЗАЦЫЯ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІН МУЗЫЧНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ЦЫКЛА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ПАЧАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

**С. М. Пацкевіч, А. С. Бойка**

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск, Беларусь, e-mail: smpackevich@gmail.com, elena.st.boyko@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца сутнасць кампетэнтнаснага падыходу ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў. Раскрываюцца